Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ
22 СТУДЗЕНЯ 1933 г.
№ 19 (3675)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказны рэдактар 769
Адказны сакратар 4-78
Сэкстаноў . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . . 2-44

АЎТАМАТЫ:
Адк. рэда-тар . 2-831
Адк. сакратар . 22-161
Сэкстары . . . 22-160
Кантора . . . 22-158

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.

Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок компарэлі 1 руб. Бліж к

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб'ёму 1 дакумэнту 2 руб.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб тэрміну скліканьня IV сэсіі ЦВК БССР X-га скліканьня

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. У зьмену ранейшых пастаноў склікаць IV Сэсію ЦВК БССР 5 лютага 1933 г.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

Па заветах Леніна

9 год таму назад памер Ленін. Каля 10 год таму назад напісаны яго апошнія артыкулы, сказаны яго апошнія прамовы. Партыя няўхільна ідзе па шляху, вызначаным Леніным, пераможна будуючы сацыялізм у СССР і гэтым аказваючы магутнейшае ўзьдзейнічаньне на міжнародную рэвалюцыю. Аб гэтым з усёй яскравасьцю і пераканаўчасьцю яшчэ раз сьведчаць вынікі пераможнага выкананьня першай пяцігодкі, падведзеныя толькі што закончаным студзеньскім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК.

Той-жа студзеньскі пленум намеціў асноўныя ўстаноўкі другой пяцігодкі і плян 1933 году.

Перад партыяй стаіць рад важнейшых канкрэтных задач: асваеньне нанова пабудаваных прадпрыемстваў, што не выключае, а прадпалагае разьвіцьцё новага будаўніцтва; павышэньне прадукцыйнасьці працы, павышэньне ўраджайнасьці, ліквідацыя рэштак разьбітага і разгромленага, але яшчэ недабітага кулацтва, ліквідацыя перажыткаў капіталізму ня толькі ў эканоміцы, але і ў сьвядомасьці людзей; зьвязанае з палітычным і гаспадарчым умацаваньнем калгасаў сацыялістычнае перавыхаваньне калгасных мас; скарачэньне і палепшаньне работы нашага дзяржаўнага апарату, функцыі якога надзвычайна ўскладніліся на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, падрыхтоўка кадраў, падбор людзей, праверка выкананьня; усямернае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, умацаваньне партыяй, яе жалезнай большавіцкай дысцыпліны, чыстка партыі ад нездзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў.

Усе гэтыя актуальнейшыя для сёньняшняга дня задачы, ня гледзячы на вялізарны шлях, пройдзены намі без Леніна, у той ці іншай форме ставіліся Леніным.

Партыя атрымала бліскучыя посьпехі, ідучы па шляху намечаным Леніным таму, што давала самы бязьлітасны адпор усякім ухілам ад ленінскай лініі, усякім пасяганьням на сваё адзінства і дысцыпліну, адсякаючы антыленінскія, антыпартыйныя элемэнты.

Партыя разграміла трацкізм, які ператварыўся цяпер у авангард контррэвалюцыйнай буржуазіі, і які пастаўляе ідэйную зброю для буржуазных рэстаўрацый сваімі тэорыямі аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў нашай краіне і няўхільнасьці буржуазнага пераражэньня нашай партыі.

Партыя разграміла правы апартунізм, які зьяўляўся агентурай кулацтва і стаяўшай за яго сьпіной міжнароднай капіталістычнай буржуазіі, і які скаціўся зараз сьледам за трацкізмам на пазіцыі ачмурэлай контррэвалюцыі.

Разгромленыя клясавыя ворагі ў краіне перайшлі да новай тактыкі, выступаючы пад ідэяй прыхільнікаў савецкай улады і калгаснага ладу, яны на справе спрабуюць разбурыць саўгасы, калгасы, арганізуюць крадзеж, сабатаж, імкнуцца падарваць сацыялістычную грамадзкую ўласнасьць і г. д. Гэтым-жа шляхам спрабуюць ісьці агенты нашых клясавых ворагаў унутры партыі. Яны перафарбоўваюцца ў прыхільнікаў генэральнай лініі партыі, на словах дэклярыуюць сваю згоду з ёй, а на справе вядуць анты-партыйную, падрыўную работу, выконваючы сацыяльны заказ міжнароднай і ўнутранай контрэвалюцыі. Так робяць трацкісты, так робяць правыя апартуністы.

Чым лепш наша партыйная маса будзе ўзброена ідэйнай зброяй ленінізму, тым больш пасьпяхова справіцца яна са сваімі вялізарнымі задачамі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, тым больш пасьпяхова будзе выкрываць клясавых ворагаў, якія пераафарбаваліся, у тым ліку і ворагаў, якія маюць партыйны білет.

Такое пераафарбоўваньне мела месца і пры Леніне з боку многіх былых меншавікоў, у тым ліку і трацкістаў, уступіўшых у партыю, пакідаючы пры сабе меншавіцкія погляды.

І Ленін пісаў у верасьні 1921 году, у разгар генэральнай чысткі, якая тады праводзілася, што партыю трэба ачысьціць «ад мазурыкаў, ад абюракраціўшыхся, ад нячэсных, ад няцьвёрдых камуністаў і ад меншавікоў, якія пераафарбавалі «фасад», але якія засталіся ў душэ меншавікамі.

Баявая задача нашай ленінскай партыі выкінуць усякую кулацкую контрэвалюцыйную нечысьць з нашых прадпрыемстваў і ўстаноў, калгасаў і саўгасаў, ачысьціць свае рады ад разлажыўшыхся і перарадзіўшыхся элемэнтаў, выкінуць вон шкоднейшых «жулікаў з партыйным білетам»—трацкісцкіх і правых двурушнікаў, якія прыкрываюцца фармальнай прыналежнасьцю да партыі. Партыя змо-жа вырашыць гэтую задачу, уздымаючы ідэйны ўзровень сваіх кадраў і партыйных мас, вядучы бязьлітасную барацьбу з усімі ўхілами ад ленінізму, з усімі праявамі апартунізму і прымірэнцтва, з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай.

Пад сьцягам ленінізму, выконваючы завет Леніна, завяршаючы пачатую м справу, партыя мабілізуе рабочыя і працоўныя масы на ажыцьцяўленьне плянаў другой пяцігодкі, на ажыцьцяўленьне пляну 1933 году, на ажыцьцяўленьне гістарычных рашэньняў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК.

Пад сьцягам ленінізму партыя мабілізуе рабочыя і працоўныя масы на пераможнае завяршэньне сац. рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, на пераможнае завяршэньне барацьбы з рэшткамі кулацтва, якія засьмечваюць нашы калгасы і саўгасы.

Апублікаваныя ва ўчарайшым нумары «Правды» рашэньні ЦК аб абавязковай пастаўцы зерня дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі дае ў рукі партыі новую магутную зброю палітычнага і гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, далейшага павялічэньня ўраджайнасьці, уздыму нашай сельскай гаспадаркі, палепшаньня забясьпечаньня рабочых.

Ленінскае вучэньне, ленінская тэорыя разьвіваецца пад кіраўніцтвам правадыра нашай партыі і міжнароднага пралетарыяту, лепшага тэарэтыка ленінізму тав. СТАЛІНА.

Ленінізм заваяваў і працягвае заваёўваць найшырокія масы рабочых і працоўных нашай краіны. Ён заваёўвае на свой бок пралетараў і сялян капіталістычных і калёніяльных краін. Ён усё мацней і мацней згуртоўвае вакол ЛЕНІНСКАГА ЦК вакол тав. СТАЛІНА нашу партыю, перадавы авангард міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі, які пабудаваў яе несакрушальную цытадэль—наш Савецкі саюз.

Наша партыя непараможна і таму, што на чале яе «стаяў на зары яе гераіцкага жыцьця такі вялізарнейшы геніяльны чалавек, як ЛЕНІН, і таму, што зараз на чале нашай партыі стаіць вялізарнейшы з саратнікаў Леніна тав. СТАЛІН». (КАГАНОВІЧ).

(СКАРОЧАНЫ ПЕРАДАВЫ АРТЫК. ПРАВДЫ»)

НІЯКІХ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫХ НАСТРОЯЎ!

Не паслабляць загатовак бульбы да поўнага выкананьня плянаў па ўсіх вучастках

Клясавы вораг выкрыты

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Жлобін. Папаратнянскі сельсавет—на чорнай дошцы. Гэта эканамічна моцны сельсавет цягнецца ў хвасьце, зрывае загатоўкі ўсіх відаў без выключэньня, ня гледзячы на тое, што ўсе ўмовы для поўнага і нават датэрміновага выкананьня плянаў загатовак тут у наяўнасьці: партыйная ячэйка налічвае 17 камуністаў, на тэрыторыі сельсавету 11 калгасаў, з дадзеных значнай колькасьцю маладога савецкага актыву; тры камсамольскіх ячэйкі: значны рабочы калектыў вакол нова-будуючагося крухмальнага заводу. І ў той-жа час у параўнаньні з мінулым годам пляны загатовак па ўсіх культурах зьніжаны амаль на палову. Пляны—упаўне рэальныя.

Аднак на самых апошніх дзён Папаратнянскі сельсавет ня вылазіць з паласы прарываў. У той час, калі ўся раённая партарганізацыя мабілізавала ўсе сілы на ліквідацыю кулацкага сабатажу загатовак і пасьпяхова за кароткі час дасягнула поўнага выкананьня пляну па збожжы і значных посьпехаў у ліквідацыі прарываў на ўсім астатнім культурам, у Папаратнянскім сельсавеце іншы малюнак. За 20 дзён—тут загатоўлена 12 цнт збожжа і на 12 студзеня плян па збожжы яшчэ невыкананы. На 8 студзеня плян па бульбе выкананы толькі на 67 проц., па лёнавалакне на 56 проц., па лёнанасеньні—на 74.4 проц., па сене на 14,8 проц., па саломе на 12,6 проц. і інш.

У чым-жа прычына гэтага недапушчальнага брыдотнага зьявішча? Першы-ж дзень работы брыгады друку на загатоўках выявіў зусім яскравае становішча гэтага сельсавету.

Апартуністычны самацёк у рабоце з самага пачатку кампаніі, адсутнасьць нават намёку на апэрацыйнасьць, на баявую бальшавіцкую мабілізацыйную работу, засьмечанасьць партыйнай ячэйкі, сельсавету, праўленьняў калгасаў кулацкімі, клясава-варожымі, контррэвалюцыйнымі элемэнтамі,—усё гэта разам узятае прывяло да разгортваньня контррэвалюцыйнага кулацкага сабатажу загатовак, які не атрымліваў ніякага адпору.

Шкодная дзейнасьць клясава-варожых элемэнтаў пачалася яшчэ з часу давядзеньня пляну загатовак да насельніцтва, да вёсак. Хітра абдуманна, кулацка-варожыя элемэнты вялі да поўнага правалу загатоўкі з самага пачатку кампаніі.

З ведамы і пад кіраўніцтвам былога старшыні сельсавету Я. зроз-на, (кулацкага агента, які раваліў калгас, выкліканы з партыі, але пад суд не аддаены), і працуючага зараз старшыні сельсавету «Камуніст» Дразлова плян па сене і саломе пры разьмеркаваньні па насельніцтвах зьмяншаецца: па сене з 800 цнт да 488 цнт., па саломе з 600 цнт да 437 цнт.

З ведамы і пры непасрэдным удзеле «прадстаўніка» партрэчэйкі Марчанкі пры разьмеркаваньні па насельніцтвы «Ураджэньне» плян зьмяншаецца: па бульбе на 5 тон, па лёнанасеньні на 72 клг, па лёнавалакне на 91 клг. Па пасёлку «Новы» плян па бульбе зьмянчаны на 3 тоны, плянны-ж па каноплях, пяньцы і саломе зусім не даведзены.

Сакратар партрэчэйкі Батракоў аб гэтым ведае, але ён ніякіх мер ня прымае для мабілізацыі партрэчэйкі, вясковага актыву на выкананьне заданняў, на ліквідацыю кулацкага сабатажу. Ён нават і не падумаў аб магчымых выніках такой апартуністычнай сьлепаты.

Але вынікі работы клясавых ворагаў з партбілетам у кішэні Батракова і Драздова ня скончыліся зьніжэньнем пляну загатовак. Тут зьніжэньне пляну набыло масавы характар, асабліва па бульбе. Сельсаветчыкі, паста віўшы ў сьпісы, у графе супроць пасёлку «Савіна» 2 тоны бульбы, «за памяталі» гэту лічбу давесьці да насельніцтва. Зараз бульба разбазарана, плян па насельніцтвы сарваны. Па пасёлку «Першамайскі» плян па бульбе зьніжаны на 5 тон, па пасёлку «Каса каўка» на 4 тоны, па пасёлку «Барэц» на 2 тоны, па пасёлку «Садовы» на 5 тон. Для пасёлку «Гарадок» плян па валакне і насеньні застаўся ў справах сельсавету, член сельсавету і сяляне аб ім ня ведаюць.

Так, клясавыя ворагі, якія пралезьлі ў рады партыі і сталі на чале кіраўніцтва сельсаветам і партчэйкамі давялі важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію да поўнага правалу, сваімі клясава-варожымі дзейнічаньнямі ўзьнімалі настрой бядняцка-серадняцкага сялянства супроць мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Ніякіх зьвестак у сельсавеце аб ходзе загатовак па паасобных пасёлках, па калгасах, па цьвёрдых заданьнях няма. Кіравалі так «абы дзень прайшоў».

На працягу ўсяго часу загатовак Батракоў і Драздоў сыстэматычна п'янствавалі цэлых дніёх і ночак ся дзелі за чаркай з рознымі цёмнымі, злачыннымі элемэнтамі. Іх п'янства з крамнікамі сельСТ Бегановым прывяло да растраты апошнім 1300 руб. Батракоў «славіўшы» 12 сьнежня гр. мадзяніна Канцелява Н. (пасёлак Дубіна), калі апошні смаліў кабана, прап'янствава ў ім увесь дзень.

У самы гарачы час загатовак Батракоў на працягу двух месяцаў не праводзіў нават партыйных сходаў і ўрэшце кінуў загатоўкі і зьнік з тэрыторыі сельсавету на—«каляды» і п'янстваваў на правяку 6 дзён.

Самога яго характарызуе, яго-ж выступленьне на партсходзе: «я моцна затаміўся, хаця і мала працаваў (3 месяцы). Ды к таму і РК партыі мяне пад вёў. Калі пасылаў мяне сюды абяцаў шмат, а я зараз атрымліваю толькі... 160 руб.» (!!!)

Прычыны зрыву загатовак ён так сама тлумачыць «па свойму»:

«Я лічу дауно, на плянуме РК гаварыў, што на дзядзьку (на працоўнага селяніна) значыць—В. З.) трэба націскнуць так, каб аж пот пайшоў. Мяне там асудзілі. Таму і работа была ў мяне дрэнная».

Гэтыя выродкі, людзі, адрадзіўшыя на важнейшым вучастку сацбудаўніцтва справе партыі і рабочае клясы і перашоўшыя адкрыта на бок контрэвалюцыі, на бок клясавага ворага,—выкрыты.

Пастановай агульнага сходу партрэчэйкі старшыня сельсавету Драздоў і сакратар ячэйкі—член прэзыдыуму сельсавету Батракоў, зьняты з работы выключаны з партыі і аддадны пад суд.

Мабілізацыяй усіх сіл партрэчэйкі і ўсяго вясковага актыву ў ходзе загатовак дасягнуты рашучы пералом. Папаратнянскі сельсавет ў бліжэйшыя два-тры дні завяршае загатоўкі па ўсіх культурах. Кулацкі сабатаж разгромлены.

РК КП(б)Б, РВК і Рай КК РСІ па вінны ўжыць тэрміновыя меры да далейшай ачысткі сельсавецкіх органаў ад клясава-варожых элемэнтаў, узмацніўшы сельсаветы моцнымі кіраўнікамі, адданымі справе партыі і рабочае клясы.

В. Задрэўскі.

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ І ЛЬНУ:

ТАЛАЧЫНСКІ

(сакратар РК т. Славін, старшыня РВК т. Лагераў, упаўнаважаны ЦК т. Тамашэўскі)

ДУБРОВЕНСКІ

(сакратар РК т. Кацман, старшыня РВК тав. Семашко, упаўнаважаны ЦК т. Шаліма).

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ

(сакратар РК т. Дашукевіч, старшыня РВК т. Себесевіч, упаўнаважаны ЦК т. Бэрзін.

СІРОЦІНСКІ

(сакратар РК т. Усенка, старшыня РВК т. Ражноўскі, упаўнаважаны ЦК т. Вільчак).

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ:

ПРАПОЙСКІ

ЖЛОБІНСКІ

(старшыня РВК тав. Антонаў, упаўнаважаны ЦК тав. Баскін)

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ЗАНЕСЕНЫ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Дзяржынскім: вёска Шэтанаўшчына, **Пятрыкоўскім раёне:** Піцкі, **Клімавіцкім раёне:** Красавіцкі сельсавет, **Легельскім раёне:** вёскі Кругляцы і Столбцы, **Бягомльскім раёне:** Дамражыцкі с/с, **Лагойскім раёне:** Гайнінскі, **Чашніцкім р-не:** Стражавіцкі, **Клічаўскім** Вірк ўскі, Грыбавецкі, Дубеньскі

па Сураскім: Камароўскі, **Аршанскім:** Буеўскі, **Пухавіцкім:** Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі, **Вушацкім раёне:** Усайскі сельсавет, **Крычаўскім:** Цяшанскі сельсавет, **Рэчыцкім раёне** Артукінскі, Хоцкіцкі, Кір вацкі сельсаветы, **Мсьціслаўскі раёне:** Татаршчанскі і Даўгавіцкі сельсаветы.

300 тон бульбы на працягу двух тыдняў пад адкрытым небам

ВУШАЧЫ. Плян адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам БССР і прамы словасьці выкананы толькі на 93 проц. Апошняя дэкада дала прырост у толькі на 3 проц. Асноўнай прычынай марудных тэмпаў зьяўляецца не паваротлівая работа загатоўчых арганізацый, асабліва спажыўкаапэрацыі, якая выканала плян толькі на 84 проц. і зусім слабы націск на кулацка-заможныя элемэнты.

Сарачынскі сельсавет выканаў плян бульбазагатовак толькі на 60 проц., прычым за апошнюю дэкаду ніякага прыросту ня даў. Старшыня Сарачынскага сельсавету Квашчэўскі і сакратар партячэйкі Кіркішчанка заяўляюць, што «бульбы няма». На самай справе бульба ёсьць, але кіраўніцтва сельсавету абыйшло кулацка-заможныя гаспадаркі. Так, у вёсцы Кашцы заможнікі Захаренка Цімох, Стуканаў Піліп, Лісоўскі Алесь і іншыя, якія маюць да 10 га зямлі захавалі па 4-5 тон бульбы і ня выконваюць цьвёрдага заданьня. Сельсавет аб гэтым ведае, але ніякіх мер ня прымае.

Асобныя сельСТ, як Гарадзецкае, Жарское, Кубліцкае і Пліскае ня выканаўшы загатоўчых плянаў ўжо зараз пачалі застаўляць на сваіх складах, на ўласныя патрэбы па 5-6 тон бульбы. Гэтай кулацка-месьніцкай тэндэнцыі з боку старшынь СельСТ, Райсаюзу і раённых арганізацый не дзецца рашучага адпору.

Загатоўленыя Вушацкім Райсаюзам 300 тон бульбы ляжыць на станцыі Лепель непакрытай ўжо больш 2-х тыдняў і не адгружаецца таму, што станцыя не падае вагонаў. Райспажыўсаюз ня прымае і ня прымае рашучых мер для хутчэйшай адгрузкі гэтай бульбы, з бюракраты са станцыі Лепель адмаўляюцца даць вагоны для адгрузкі яе па нараду Чашніцкаму броварному заводу.

Слова за пракуратурай! (Белта).

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Па мерах апрысьнятых для ўзмацненьня лес загатовак і лесавывазкі

Для ўмацненьня лесазагатовак і лесавывазкі ў першым квартале 1933 г. СНК БССР і ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Абавязаць усе райкомы КП(б)Б і раённыя выканаўчыя камітэты безадкладна ўжыць рашучыя захады да выкананьня пляну дровалесазагатовак і вывазкі, мабілізаваўшы на гэтую справу ўвагу ўсяго партыйнага і савецкага актыву, як на справу, якая мае палітычна - гаспадарчае значэньне. Даць рашучы адпор усім тым, якія сваю дрэнную працу па лесазагатоўкам і лесавывазкам тлумачаць апартуністычнымі разважаньнямі аб тым што кліматычныя ўмовы (адсутнасьць саннага шляху) перашкаджаюць выкананьню пляну вывазкі. Ускласьці персональную адказнасьць за поўнае выкананьне пляну лесазагатовак і вывазкі на старшынь рэённых выканаўчых камітэтаў нарадзе з дырэктарамі леспрамгасаў і лестрансгасаў.

2. Прапанаваць усім упаўнаважаным ЦК КП(б)Б па загатоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў абавязкова ўвязваць працу па загатоўках з поўным выкананьнем пляну дровалесазагатовак і вывазкі, даючы рашучы адпор апартуністычным настроям аб чарговасьці кампаній.

3. Прапанаваць усім райкомам КП(б)Б і РВК павесьці рашучую бальшавіцкую барацьбу з клясава-варожымі элемэнтамі, якія зрываюць плян дровалесазагатовак, і строга сачыць за выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка - заможнымі гаспадаркамі, прыцягваючы іх да судовай адказнасьці за невыкананьне цьвёрдых заданьняў. Прапанаваць леспрамгасам устанавіць дасканалы вучот выкананьня заданьняў па самазавязацельствах па дагаворох, якія заключаюцца паміж калгасамі, аднаасобнікамі і леспрамгасамі, прыцягваючы вінаватых у зрыве гэтых заданьняў да строгай адказнасьці.

4. Прапанаваць рэдакцыям газэт «Зьвязда» і «Савецкая Беларусь» і усім раённым газэтам сыстэматычна асьвятляць у друку становішча выкананьня пляну дровалесазагатовак і вывазкі, зьмяшчаючы 5-дзённыя зводкі, і практыкаваць пасылку выезьдных брыгад на месцы дровалесазагатовак.

Практыкаваць на старонках друку занясеньне на чорную дошку тых леспрамгасаў і лестрансгасаў, якія зрываюць дровалесазагатоўкі і вывазку.

5. Прапанаваць усім райкомам КП(б)Б і раённым выканаўчым камітэтам спыніць перакідку работнікаў леспрамгасаў і лестрансгасаў на іншыя работы і безадкладна зьвярнуць тых працаўнікоў, якія накіраваны на іншыя работы альбо для правядзеньня розных кампаній.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б І. ІВАНОЎ.
20 студзеня 1933 г.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Пра назначэньне асоба ўпаўнаважаных ЦК КП(б)Б і СНК па арганізацыі і вывазцы торфу

Савет Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

Назначыць Асобаўпаўнаважаных СНК і ЦК КП(б)Б—Старшынь наступных раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх сачетаў па арганізацыі і вывазцы торфу: па Дубровенскім РВК тав. Семашко, Церахоўскім—тав. Дуканава, Уваравіцкім—тав. Караленка, Сіроцінскім—тав. Ражноўская, Рэчыцкім—тав. Шляхтунова, Чашніцкім—тав. Папко, Смалявіцкім—тав. Кузенцова, Асіпавіцкім—тав. Młодзка, Быхаўскім—тав. Грынкевіча, Магілеўскім—тав. Сапрыцкага, Крычаўскім—тав. Захараву, Бабруйскім—тав. Аксючыца, Гомельскім—тав. Браўковіча, Аршанскім—тав. Валасевіча, Віцебскім—тав. Кардашэнка, Веткаўскім — тав. Сьнігіна, Горацкім — тав. Кандраля, Гарадокскім—тав. Ядасева, Дрысенскім—тав. Орсіка, Дзяржынскім—тав. Вансоўскага, Жлобінскім—тав. Антонава, Крупскім—т. Сільвестрава, Клічаўскім—тав. Грыбаедава, Чэрвеньскім—тав. Бушмана, Шклоўскім—тав. Мінчонка, Барысаўскім—тав. Баранчыка, Сураскім—т. Русака, Менскім—тав. Каранеўскага, Сенненскім—тав. Себесевіча, Чавускім—тав. Адамчука, Пухавіцкім—тав. Ступакова, Ратачэўскім—тав. Мацко, Талачынскім—тав. Лагерэва, ускладаючы на іх персональную адказнасьць за ход вывазкі торфу з торфазаводаў іх раёнаў і дазграмчуўшы работу так, каб вывазка была скончана да 15 сакавіка г. г.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б І. ІВАНОЎ.
20 студзеня 1933 г.

ВЯЛІКІ ВУРОК

(22-9 студзеня 1905 г.)

«Пачатак рэвалюцыі ў Расіі»—так азначыў У. І. Ленін пецярбургскія падзеі 22 (9) студзеня 1905 г. «Рабочая кляса,—пісаў ён,—атрымала вялікі вурок грамадзянскай вайны; рэвалюцыйнае выхаваньне пралетарыяту за адзін дзень ступіла наперад так, як яно не магло-б ступіць у месяцы і гады шэрага, буднічнага, забітага жыцьця.

Ленінская ацэнка расстрэлу пецярбургскіх рабочых, ленінскі прагноз далейшага разьвіцьця пецярбургскіх падзей аказаліся зусім правільнымі. Залпы «самага подлага, хладнакроўнага забойства безабаронных і мірных народных мас» (Ленін) тысячагалосым рэхам аддаліся па ўсёй Расіі, адтачылі клясавую палітычную сьвядомасьць рабочых мас, актывізавалі іх рэволюцыйную волю, узмоцнілі іх клясавую згуртаванасьць і прывялі да першай у гісторыі ўсеагульнай стачкі, паказаўшай вялікую магутнасьць пралетарскай баявой салідарнасьці.

У падзеях 22(9) студзеня адбілася сваяасаблівае спалучэньне супрацьлеглых сацыяльных зьявішч: стачка, пачатая рабочымі пуцілоўцамі і хутка ахапіўшая ўсе буйныя заводы Пецярбургу, з лікам рабочых да 93 тысяч, стачка, якая набыла яўна палітычны характар з аднаго боку, і з другога—масавае шэствіе да Зімняга Дварца з глыбокай верай у «гасудара», які царствуе «міласьцю боскіх законаў» (З пэтыцыі рабочых цару).

Гэтае сваяасаблівае спалучэньне адбілася і ў пэтыцыі цару: «усепадданейшы адрас рабочых Пецярбургу і яго вялікасьці «напоўнены скаргамі і просьбамі да цара, які «пастаўлены на шчасьце народу» і разам з тым гэты «адрас» уключае ў сабе палітычныя патрабаваньні аж да скліканьня ўстаноўчага сходу, узятыя з праграмы—мінімум расійскай сацыял-дэмакратыі.

Аб'ясьненьне такому сваяасаблівому спалучэньню ляжыць у гісторыі папярэдняй барацьбы рабочае клясы. Ужо ў 70-х гадох, на зары пралетарскага руху, рабочыя стачкі ня былі рэдкасьцю.

Яны выбухалі ў розных канцах Расіі, як пр. эст супроць нязноснага ўціску капіталістаў і памешчыкаў.

80-я гады—гады крызісу (1876-1861 г.) —прыносьць далейшы рост стачачнага руху і славутую «марозаўскую стачку» у Арэхава—Зуево, ахапі шую восем тысяч рабочых тэкстыльшчыкаў і праведзеную з вялікай вытрыманасьцю і наможлівасьцю. Стачка працягвалася восем дзён і была разгромлена толькі з дапамогай узброенай сілы. Ня гледзячы на разгром, ня гледзячы на тое, што рабочыя прымушаны былі стаць на работу, не дабіўшыся задаволеньня сваіх патрабаваньняў, марозаўская стачка мела вялікае значэньне для разьвіцьця рэвалюцыйнага рабочага руху.

90-я гады далі новы падём стачачнай хвалі. За пяць год (1895—1899) лік стачачнікаў дасягнуў поўнальёна чалавек. Стачкі робяцца ўсё больш упартымі, аб'ем эканамічных патрабаваньняў рабочых пашыраецца (аплата павышэньня зарплаты, выступае патрабаваньне скарачэньня рабочага дня да 10 гадзін), рабочыя ўсё часьцей аказваюць супраціўленьне паліцыі (фабрыка Поля у Пецярбургу—у 1898 г., майскія баі на вуліцах—1899 г. і г. д.). Стачачная барацьба, гвалты і лютыя расправы паліцыі абуджаюць у рабочых масах сьвядомасьць клясавага адзінства, агульнасьці інтарэсаў, клясавай салідарнасьці. Вярхоўнай гэтага росту клясавай сьвядомасьці зьяўляецца пераход рабочых да мэтадаў палітычнай барацьбы. Уся абстаноўка царызму, яго нічым ня прыкрытая палітыка абароны паліцэйскай зброяй, казацкімі атакамі, залпамі салдацкіх рот, турмамі і ссылкамі, сыстэмы капіталістычнага грабяжу рабочых мас, няўнікі на ня а рабочых да сьвядомасьці, што экана мічная барацьба недастаткова, што ёю можна дасягнуць толькі вельмі аб ежаваных мэтаў. Але адна справа бачыць ў паліцэйскім і ўдэрнатары ворага, які заўсёды стаіць на сок прыгнятальнікаў—капіталістаў, другая справа—зразумець неабходнасьць зламаць усю палітычную сыстэму царызму, на чале з «божым памазаніком»—царом.

Вопыт барацьбы усё бліжэй падводзіў масы да ўсьведамленьня гэтага.

Такія факты, як славутая «Абухаўска абарона» (май 1901 г.), калі габочыя Неўскай заставы (Пецярбург) ужо ўжылі барыкадную барацьбу супроць паліцыі і войска, калі заклік «далоў самаўладзтва» і чырвоныя сьцягі лыналі на вуліцах рабочага прадмесьця,—такія факты не праходзілі бяз сьледу.

Усе большае рэвалюцыянізуючае і арганізуючае значэньне набывала Гработа сацыял—дэмакратыі, перайшоўшай ад гурткоўай замкнутасьці да работы ў масах, да шырокай агітацыі. На выключную неабходнасьць і надзвычайную важнасьць гэтай работы маладых сацыял-дэмакратычных арганізацый указваў Ленін. «Стачкі 90-х гадоў—пісаў ён—паказваюць нам куды больш проблісках сьвядомасьці Усятыя самі па сабе гэтыя стачкі былі барацьбой пэрад-юніяніскай але яшчэ не сацыял-дэмакратычнай, яны знамена валі сабою абуджэньне антаганізму рабочых і гаспадароў»... Сацыял-дэмакратычная сьвядомасьць «прыўнесе на толькі зьне» («Што рабіць»). І далей «Стыхійны падём маў у Расіі ад быўся з такой хуткасьцю, што сацыял-дэмакратычная моладзь аказалася не падрыхтаванай да выкананьня гэтых задач». Ленін не абмяжоўваецца толькі прапановай «сьці да рабочых». Ён выкідвае чоткі бальшавіцкі плян арганізацыі прафесіянальных рэвалюцыянэраў, плян масавай газэты, якая-б «стала частачкай аграмадзнага кавальскага цэху, разьдзьмухаючага кожную іскру клясавага барацьбы і народнага абурэньня ў агульны пажар». (Ленін).

Царскі ўрад спрабаваў процідаставіць рэвалюцыйнай рабоце сацыял-дэмакратыі, памяма карнага апарату, свой, паліцэйскі «сацыялізм» вядомы, па яго надзвычайцы—охраньніку Зубатаве, пад клічкай «зубатаўшчыны». Гапонаў шчына, адыгрываючая ў падзеях 22 (9) студзеня выключную ролю, зьяўляла ся простым працягам зубатаўшчыны. Дапускаючы ў жыцьцё арганізаванае Гапонам «Сабраньне рускіх фабрычна-заводзкіх рабочых гораду Санкт-Пецярбургу», урад разьлічваў намяраваць гэты рух у рэчышча сваёй чорнасоценнай палітыкі, процідаставіць яго росту ўплыву сацыял-дэмакратыі. Дёгіка клясавай барацьбы разьбіла нашчэнт гэты плян. Гапонаўскае тавыстрыла ня ў сілах было ні адхіліць стачку пуцілоўцаў, пачатую 16 (3) студзеня 1905 г., ні спыніць яе пашырэньне. Наадварот, яно прымушана было ўмяшацца ў гэтую стачку, абараняючы перад заводчыкамі патрабаваньні пуцілоўцаў. Гапон прымушан быў, каб не страціць свайго ўплыву на масы, стаць на чале з праважацыйнай мэтай магутнага выбуху абурэньня пецярскіх рабочых, каб накіраваць яго ў рэчышча «суседданьнейшага адрасу». цару. На фаціе барацьбы да падзей (9) 22 студзеня сацыял-дэмакратыі з Гапонам можна бачыць, як меў рацыю Ленін, калі пісаў, што сацыял-дэмакратыя не падрыхтавана да аўладаньня стыхійных падёмам мас. Масы пайшлі за Гапонам. Але, з другога боку, Гапон ня мог абыйсьці ў пэтыцыі тых патрабаваньняў, якія ўжо ўклініліся ў сьвядомасьць мас і якія зьявіліся рэзультатам папярэдняй клясавай барацьбы і ўплыву на масы сацыял-дэмакратыі. Заставалася вера ў цара, яшчэ неразбураная рэвалюцыйнай работай. Яе разбурыў цар расстрэлам бязбройнай рабочай масы. У рэзультаце гэтага «Рускі рабочы рух за некалькі дзён падняўся на вышэйшую ступень» (Ленін)... «Маса робіць гераічныя намаганьні падняцьціна вышыню навязаных ёй гісторыяй гіганцкіх сусьветных задач, як-бы не вялікіх былі асобныя паражэньні, як-бы не шаламілі нас патокі крыві і тысячы ахвяр—нішто і ніколі не параўнаецца па сваім значэньні з гэтым непасрэдным выхаваньнем мас і клясаў у ходзе рэвалюцыйнай барацьбы» (Ленін).

Вялікі крывавы вурок, атрыманы пралетарыятам 22 (9) студзеня разбурыў канчаткова веру ў цара. Перад працоўнымі масамі ва ўсёй нагаце паўстала гнусная сыстэма самаўладзтва, якую трэба зламаць.

З гэтага моманту сацыялістычная сьвядомасьць расійскага пралетарыяту расла сямімільнымі крокамі.

Ня гледзячы на разгром першай рэвалюцыі, рабочая кляса пістарычна надзвычай моцна адстаявіла свае рэвалюцыйныя сілы і пад кіраўніцтвам ленінскай партыі большавікоў праз дванаццаць год пасьля 22 (9) студзеня яна ўжо расправілася з самаўладзтвам, а ў Кастрычніку і з капіталістамі.

Гэтымі фактамі вялікіх

Трактарны парк падрыхтаваць да сяўбы

Уключыць у конкурс на хутчэйшы і лепшы рамонт трактару усе МТС і МТМ

Рамонту трактараў--сацыялістычныя мэтады працы

Правільная, сваячасовая і добраякасная апрацоўка глебы мае надзвычайна вялікае значэньне ў справе падвышэньня ўраджайнасьці нашых сацыялістычных палёў. Гэта, бязумоўна, будзе адыгрываць надзвычай на вялікую ролю ў вырашэньні саўгасамі і калгасамі пастаўленай перад імі задачы падняцьця ўраджайнасьці.

Бясспрэчным таксама зьяўляецца тое, што правільная сваячасовая і добрая апрацоўка глебы і сваячасовае правядзеньне веснавой сяўбы 1933 г. залежыць ад падрыхтаванасьці ўсіх сродкаў вытворчасьці калгасаў і саўгасаў і, у першую чаргу, МТС. Між тым, тэмпы ходу падрыхтоўкі МТС да веснавой сяўбы 1933 г. гавораць аб тым, што на гэтым вучастку ня ўсё добра. Па агародна-бульбяным Трактарацэнтры адрамантавана толькі 30 трактароў, што складае 6 проц. гадавога пляну і 17 проц. календарнага.

Паданыя лічбы сьведчаць аб тым, што такія тэмпы работы не забясьпечваюць выкананьня пляну рамонту трактарнага парку ў тэрмін, устаноўлены ўрадам—да 15 сакавіка.

Асабліва бязьдзейнічаюць Церахаўская, Жлобінская, Магілеўская і Полацкая майстэрні.

Конкурс, абвешчаны Трактарацэнтрам, умовы якога друкуюцца ў сёньнішнім нумары нашай газэты, павінен быць шырока скарыстаны загадчыкамі майстэрняў і дырэктарамі МТС, як стымул для мабілізацыі рабочых майстэрняў, МТС, калгасаў і калгаснікаў на тэрміновае, поўнае і добраякаснае выкананьне пляну рамонту, ужываючы пры гэтым сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарництва.

Бягучая рамонтная кампанія будзе праходзіць ва ўмовах некаторага недахопу востра-дэфіцытных тавараў—запасных частак, волава, бабіту, у сувязі з гэтым неабходна асабліва эканомна выдаткаваць гэтыя матар'ялы, максымальна выкарыстоўваючы унутраныя рэсурсы.

Бязумоўна, што рэшткі кулацка-капіталістычных элемэнтаў будуць рабіць спробы пралезьці ў майстэрні і там весьці сваю падрыўную работу. Таму, ад партыйных органаў, пасобных камуністаў і ўсіх добрасумленных работнікаў патрабуецца асаблівая пільнасьць у справе выяўленьня клясава-чужых элемэнтаў і арганізацыі рашучага адпору зрыўшчыкам выкананьня пляну рамонту.

Скончыць да 1 сакавіка рамонт трактарнага парку — такава задача ўсіх МТС і майстэрняў.

В. Карнейчык

Даць трактарам запасныя часткі

Ворша. (Наш кар.). Паводле пляну, МТМ павінна сёлета адрамантаваць 200 трактараў і завод «Чырвоны барацьбіт»—124.

На справе ж рамонт сельска-гаспадарчых машын па раёне не разгорнуўся. Да гэтага часу ня маюць пляну рамонту ні машынна-трактарныя майстэрні, ні завод «Чырвоны барацьбіт», ні іншыя майстэрні і аб'яднаньні, у якіх есьць трактары і якія павінны іх рамантаваць.

Завод «Чырвоны барацьбіт» і МТМ да гэтага часу не набылі матар'ялаў, інструманту і запасных частак. Больш таго, яны нават ня ведаюць, якія сродкі рамонту ім будуць патрэбны. Дырэкцыя заводу і кіраўніцтва МТМ да гэтага часу яшчэ не пакланаліся заключыць умовы з тымі саўгасамі, якім яны будуць рамантаваць трактары.

Сьнежаньскі плян рамонту трактараў сарваны. Трэба было адрамантаваць 25 трактараў, не адрамантавана ніводная машына, а завод «Чырвоны барацьбіт» замест 8 адрамантаваў толькі—3. Таксама не наладжаны выраб востра-дэфіцытных частак для трактараў. (пальцы, поршні, кольцы, шатунныя балты і г. д.) ня гледзячы на тое, што для гэтага ёсьць усе ўмовы.

На заводзе адчуваецца недахоп у кваліфікаваных рабочых, а яшчэ горш абстаіць гэта пытаньне ў МТМ.

Вельмі дрэнна здбіваецца на рамонце трактараў і тое, што арганізацыі, якія павінны забясьпечваць МТМ і завод патрэбнымі матар'яламі, не спраўляюцца з гэтай задачай. База Снабрамонту ня мае большасьці патрэбных запасных частак і матар'ялаў, гэта ставіць пад пагрозу зрыву рамонту трактараў.

МТМ і завод адчуваюць вялікі недахоп у вугалі. Арцелі Лесдрэўхіму хацця вугаль і маюць, але яны, ня улічваюць важнасьці рамонту трактараў, і вельмі мала яго адпускаюць. Лесдрэўхім павінен даць указаньні сваім арцелям аб продажы вугалю для МТМ і заводу ў патрэбнай колькасьці, ка ня было затрымкі ў рамонце.

Рамонт трактараў павінен быць пастаўлены на ўдарныя тэмпы. Трэба скласьці календарныя пляны рамонту трактараў сельска-гаспадарчых машын, заключыць умовы з саўгасамі, МТС і іншымі арганізацыямі, забясьпечыць завод і, у першую чаргу, МТМ патрэбнай рабочай сілай, наладзіць выраб запасных частак для трактараў, забясьпечыць завод і МТМ вугалем Базы Снабрамонту і Белсельгаспснабу павінны неадкладна і ў патрэбнай колькасьці забясьпечыць завод і МТМ патрэбнымі для рамонту трактараў матар'яламі.

Сталёвыя коні павінны выйсьці на сацыялістычныя палі вясной у поўнай баявой гатоўнасьці і гэтым забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне вясновай сяўбы першага году пяцігодкі.

А. Воршын.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра назначэньне т. Розіна, А. Г. асобаўпаўнаважаным СНК БССР па загатоўцы і вывазцы лесу

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе** назначыць тав. Розіна, Абрама, Грыгоравіча Асобаўпаўнаважаным СНК БССР па загатоўцы і вывазцы лесу.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР.

М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР.

Ф. СУЛКОЎСКІ.

Умовы конкурсу

на лепшае правядзеньне рамонтнай кампаніі гародніна-бульбянога Трактарацэнтру да веснавой сяўбы 1933 г.

У конкурс могуць уключацца ўсе майстэрні як капітальнага, так і бягучага рамонту сыстэмы Г-Б Трактарацэнтру паводле пастановы апульнага сходу работнікаў майстэрняў. Работнікі майстэрняў адначасова з уключэньнем у конкурс бяруць на сябе выкананьне адпаведных абавязкаў, якія забясьпечваюць сваячасовае поўнае добраякаснае правядзеньне рамонту.

Асноўнымі паказьнікамі, па якіх будзе праводзіцца ацэнка работы пасобных майстэрняў па выкананьні пляну рамонта, устанаўляюцца:

а) правядзеньне рамонту ў скарочаныя тэрміны, ва ўсякім разе не пазьней 1 сакавіка 1933 г.;

б) правядзеньне рамонту з мінімальнай затратай востра-дэфіцытных тавараў—запасных частак, бабіту, волава—пры максымальным скарыстаньні ўсіх матар'ялаў;

в) зьніжэньне кошту рамонту ня менш, як на 15 проц. супроць ся рэдня-устаноўленай нормы кошту рамонту.

г) скарачэньне часу на правядзеньне рамонту трактараў ня менш як на 20 проц. устаноўленых норм;

д) добраякаснасьць рамонту ўсе танаўлаецца камісіяй, якая складаецца ў адпаведнасьці з пакі заньнямі Трактарацэнтру.

Аб кожнай прыёмцы адрамантаваных трактараў і інвэнтару складаецца адпаведны акт.

За лепшае выкананьне работ вызначаюцца прэміі: адна прэмія ў 1000 руб., 2 прэміі—ад 300 да 600 руб., 2 прэміі—ад 250 да 500 руб., 14 прэмій—ад 175 да 450 руб. і 2 прэміі—ад 225 да 450 руб.

Тэрмін конкурсу ўстанаўляецца з 1-II па 1-IУ 1933 г. Не пазьней 1-IУ 1933 г. усе майстэрні павінны выслаць матар'ял аб выкананьні пляну рамонту.

Разьмеркаваньне прэмій праводзіцца не пазьней 15-IУ.

Дзяржынская машына-трактарная майстэрня дрэнна рамантуе трактары

Паводле пляну, Дзяржынская машынатрактарная майстэрня павінна абслужыць 10 МТС, адрамантаваць 211 трактараў і матораў.

У зьвязку з гэтым перад рабочымі і адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам стаіць задача—поўнасьцю забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне плянавых заданьняў у тэрмін. Але на справе рамонт машын разгортваецца вельмі марудна і дрэнна. Да гэтага часу няма неабходных запасных частак для трактараў, у мантажным цэху валяецца шмат разабраных машын.

Ня лепш абстаіць справа і ў мэханічным цэху, тут бываюць частыя прастоі варштатаў, з-за непадачы энэргіі. З прычыны нядбайных адносін з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу новы рухавік быў устаноўлены на такім фундаманце, які ў час пуску на чэ хістацца, гэта прымушае зноў перарабляць фундамант. У выніку—на 1 студзеня замест 54 трактараў адрамантавана толькі 29.

Партыйная ячэйка з 8 камуністаў досыць здольных і добра падрыхтаваных ніякіх канкрэтных мер на прымае да зьнішчэньня прарыву. Больш таго, ячэйка месяцамі ня скліча сходаў і бюро, пытаньне прарыву перад рабочай масай не завострываецца. Прыкладам таму, што ячэйка бязьдзейнічае зьяўляецца тое, што на вечары, прысьвечаным дню ўдарніка, быў перададзены пераходны ганаровы сьцяг кавальнаму цэху, які пляны выканаў толькі на 93 проц.

Загадчык майстэрні тав. Лазарэвіч у сваім выступленьні зазначыў, што гэты цэх прэміруецца таму, што ён недавыканаў плян на 7 проц. не па сваёй уласнай віне, а па прычыне прастояў і непадачы энэргіі.

Каб ліквідаваць прарыў і сваячасова выканаць вызначаны пракатнаму парку плян рамонту, ячэйцы неабходна зараз-жа перабудаваць работу майстэрні, якая-б забясьпечыла бальшавіцкія тэмпы работы. Неабходна згуртаваць рэбочую думку вакол пытаньня рамонту, трэба тэрмінова прыняць меры, каб новы рухавік быў пушчаны.

Р. І.

Хроніка

▲ **КАМІТЭТ ПА ФІЗКУЛЬТУРЫ**, на правах сталай камісіі, створаны пры Калегіі Наркамасьветы БССР. Камітэтам распачата работа па масавым аглядзе фізкультурнай работы ў сыстэме НКА, як падрыхтоўка да сусьветнай спартакіяды.

▲ **ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ** ў падрыхтоўку да беларускай і сусьветнай спартакіяды праводзяцца зараз у 20 жывёлагадоўчых саўгасах БССР.

▲ **МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ АЎТАДОРУ** адбудзецца 23 студзеня. Канфэрэнцыя заслухае справаздачу Цэнтральнага і гарадзкога савету Аўтадору і абярэ новыя кіруючыя органы.

Да канфэрэнцыі выйдзе спэцыяльная газэта.

▲ **ВЯЛІКІ ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР** у сувязі з юбілеем Серафімовіча (з прычыны 70 годзьдзя са дня нараджэньня) наладжвае аргкамітэт саюзу савецкіх пісьменьнікаў БССР. На вечар запрошаны юбіляр.

▲ 19-20 студзеня ў клюбе харчавікоў адбыліся міжгародныя сустрэчы па барацьбе і боксу паміж камандамі Харкаву і Менску. У першы вечар выступала другая зборная каманда Менску, у другі—1 каманда Менску. Харкаўская каманда, якая мела ў сваім складзе мацнейшых барацьбітоў і баксёраў Украіны выграла як у першым так і ў другім вечары з лікам 7 : 1».

Паміж сэкцыямі барацьбы Харкаву і Менску заключаны саццагавор на лепшую падрыхтоўку да сусьветнай спартакіяды.

За ГРАНІЦАЙ

„Дзіўная падзея—параход не згарэў!"

«Правда» у разьдзеле «ПО СТОЛБЦАМ ЗАРУБЕЖНОЙ ПЕЧАТИ» друкуе пад загалоўкам—«НЕОЖИДАННЫЕ СОБЫТИЯ—ПАРОХОД НЕ СГОРЕЛ!» наступнае.

Парыская сатырычная газэта «Канар Аншэнэ», глумячыся над часты мі пажарамі на французскіх параходах, піша ў артыкуле «Неожиданные события»—«параход нашага гандлёвага флёту прыбыў у порт бяз усякіх інцыдэнтаў».—«Міністар гандлёвага мораплаваньня ашаломлены!»

«Учора адбылася зусім дзіўная падзея, да якой міністэрства гандлёвага мораплаваньня да гэтага часу ня можа даць істотнага тлумачэньня. Параход, які вышаў учора раніцою з Бардо, прыбыў у цэласьці ў Сен-Назэр!

Гэты факт, сапраўднасьць якога мы гарантуем, сабіў, як і варта было чакаць, ураженьне, якое зусім немагчыма апісаць. Паглядзімо, што кажуць атрыманыя паведамленьні.

Вышаўшы з Бардо ў зусім нармальных умовах,—а гэта значыць, што людзі, якія засталіся на Набережнай, былі упэўнены ў тым, што яны параход больш ня ўбачаць,—параход «Франц IУ» хутка зьнік за кругавідам. Усе вярочаліся дадому з паніклымі галовамі. Аднак, роўна ў 11 гадзін 30 мінут было атрымана наступнае паведамленьне па радыё: «Франц IУ» працягвае свой шлях бяз усякіх аварый. Да гэтага часу пажару не наглядаецца».

Параход указаў свае месца радыёвя шчэньня, правільнасьць якога была ўстаноўлена многімі другімі пароходамі, якія ішлі па тым-жа шляху.

Гэтае сэнсацыйнае паведамленьне зрабіла вялікае ўражаньне на ўсё ўзьбярэжнае насельніцтва. Прэфэкт Рожфора тэлеграфаваў свайму брэсканму калегу: «Мне паведамілі, што параход «Франц IУ», які накіроўваецца ў Сэн-Назэр, усё яшчэ цэлы і непашкоджаны. Ня трацьце спакойства».

У Сэн-Назэр, дзе ўжо стаялі на пагатове пажарныя, параход «Франц IУ» прыбыў дакладна ў тэрмін. На барту ніякіх сьлядоў пажару.

Морскае міністэрства выпусьціла учора наступнае паведамленьне:

«МОРСКАЯ ПРАФЭКТУРА ў БРЭСЬЦЕ АТРЫМАЛА ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ, ШТО ФРАНЦУСКІ ПАРАХОД, ПАБУДАВАНЫ НА ФРАНЦУСКІХ ВЕРФЯХ, ПРЫБЫЎ У ЦЭЛАСЬЦІ І НЕПАШКОДЖАНЫМ У ПОРТ СЭН-НАЗЭР. МЫ ПАЗБАЎЛЕНЫ ПАКУЛЬ ШТО МАГЧЫМАСЬЦІ ДАЦЬ ЯКІЯ-НЕБУДЗЬ ТЛУМАЧЭНЬНІ АДНОСНА ГЭТАГА ТАЕМНАГА ЗДАРЭНЬНЯ».

Даламо да гэтага, што на верфях, дзе быў пабудаваны параход «Франц IУ», панує поўнае замяшацьцельства. Будаўнікі параходу ня могуць зразумець, чаму ён ухіліўся агульнага лёсу.

Францыя

„Вельмі часта спасылаюцца на кароткія замыканьні"

ПАРЫЖ. 20-1. «Гавас» паведамляе: «што за час дыскусіі адносна законапраекту аб узмацненьні бясьпечнасьці мораплаваньня, ужо прынятага палатай дэпутатаў, міністар гандлёвага флёту Мейер заявіў, што судовае сьледства адносна пагібелі «Атлянтыка» працягваецца. «Я ня выключаю,—сказаў ён,—ніякай гіпатэзы, нават злоўмыства. Вельмі часта спасылаюцца на кароткія замыканьні. Гэтае тлумачэньне магло быць прыемлемым для «Джорджа Філіпара», але інакш абстаіць у выпадку з «Атлянтыкам». Можна было прыняць меры перасьцярогі. Асабістая віна адказных асоб зьяўляецца бясспрэчнай. Сярод экіпажу і камандваньня хто-ні-хто страціў галаву. З самага пачатку з агнём змагаліся недастаткова энэргічна».

Абвал, які засыпаў 6 гарнякоў

ПАРЫЖ. 20-1. Агенцтва «Гавас» паведамляе: «што ў вугольных капальнях «Маркінэль» у Люксэмбурзе адбыўся абвал, які засыпаў шэсьць гарнякоў. Засыпаныя рабочыя не адказваюць на падаваныя ім сыгналы».

Амэрыка

Кантроль над экспартам зброі

ВАШЫНГТОН. 20-1. Сэнат прыняў рэзалюцыю, якая дае прэзыдэнту паўнамоцтвы па ўстанаўленьні кантролю над экспартам зброі і ваеннага рыштунку. Палатай прадстаўнікоў рэзалюцыя пакуль што яшчэ ня прынята.

Мэмарандум з 140.000 подпісаў

НЬЮ-ЕРК. 20-1. Паводле паведамленьняў «Монрыал газэт», прадстаўнікі савету беспрацоўных Канады наведалі канадзкага прэм'ера Бенета і прадставілі яму мэмарандум з патрабаваньнем увядзеньня страхаваньня беспрацоўных і аказаньня безадкладнай урадавай дапамогі беспрацоўным. Пад мэмарандумам зьмяшчаецца 140000 подпісаў.

„Купляйце амэрыканскія вырабы"

НЬЮ-ЕРК. 20-1. Міністэрства гандлю абвясьціла, што яно адмаўляецца ад афіцыйнага падтрыманьня руху пад лёзунгам «купляйце амэрыканскія вырабы», якое імкнецца байкатаваць імпартныя тавары. Міністэрства гандлю заяўляе, што ПАЗШ зьяўляецца крэдыторам іншых краін і што інтарэсы амэрыканскіх экспарцёраў і імпарцёраў таксама пазбаўляюць урад магчымасьці афіцыйна падтрымліваць рух за далейшае абмежаваньне імпарту. Прэса «Хэрста» узмоцнена працягвае кампанію пад лёзунгам «купляйце амэрыканскія вырабы».

Сутычкі паміж паліцыяй і дэманстрантамі

ВЕНА, 20-1 Як паведамляюць з Бухарэста, у сувязі з надыходзячымі ленінскімі днямі румынская сігуранца (охранка) праводзіць па ўсёй краіне масавыя арышты па западозраньні ў камуністычнай дзейнасьці. У Клужы (цэнтр Семіградзьдзя), дзе ў сярэдзіне студзеня было арыштавана звыш 50 рабочых, западозраных у камуністычнай дзейнасьці, рабочыя наладзілі бурную дэманстрацыю. Дэманстрацыя прайшла пад лёзунгам: «за анэксіі саюз і ленінізм—супроць імпэрыялістычнай вайны». Адбылася сутычка паміж паліцыяй і дэманстрантамі. Шмат рабочых арыштавана.

Ліга Нацый дапамагае Японіі

ТОКІЕ, 20-1. Японскі друк публікуе паведамленьне з Жэнэвы аб перагаворах Мацуока, а таксама аб надыходзячым спатканьні Мацудайра (японскі пасол у Англіі) з Саймонам.

У міністэрстве замежных спраў, як зазначае друк, задаволены адказам камісіі «19» ад запрашэньня ПАЗШ і СССР і думаюць, што астатнія японскія патрабаваньні, якія адносяцца да праекту рэзалюцыі ад 20 сьнежня, будуць таксама прыняты. Падкрэсьліваецца, што Японія прыкладае ўсе сілы да зьнішчэньня з праекту рэзалюцыі ўказаньня на тое, што «захаваньне прызнаньня крызіснага становішча ў Манчжурыі ня можа быць прызнана вырашэньнем пытаньня». Японія прыкладае таксама намаганьні да зьмякчэньня фармулёвак, якія ўтрымліваюць у сабе спасыланьні на даклад Літона.

ІНСТРУКЦЫЯ

Наркамснабу СССР пра парадак арганізацыі і правядзеньня дзяржаўных загатовак масла, малака і сыру ў 1933 г.

Зацьверджана СНК Саюзу ССР 16 I 1933 г.

Загатоўкі масла, малака і сыру на аснове пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 сьнежня 1932 г. ажыцьцяўляюцца НКСнабам СССР, па дырэктывах Камітэту па загатоўках пры СПА, праз сетку масласыразаводаў, зьліўных і сепаратарных пунктаў Наркамснабу СССР (трэсты Саюзмаслапромаў, Саюзмалака і Брынзатрэсту) і праз сыстэму спажывецкай кааперацыі з тым, каб у кожным адміністрацыйным раёне загатоўкі масла, малака і сыру ўтвараюцца толькі аднэй за гатоўчай арганізацыяй.

I. Загатоўка малака і масла ў калгасьнікаў і аднаасобных сялянскіх гаспадарак

1. Да абавязковай пастаўкі малака ў парадку падатку прыцягваюцца ўсе аднаасобныя сялянскія гаспадаркі і двары калгасьнікаў, маючых кароў (у т. л. першацёлак 1-га паўгодзьдзя 1933 г.) і буйваліц.

Нормы здачы малака для першацёлак устанаўляюцца ў палавінным памеры супроць нормаў, устаноўленых для данага раёна і адпаведнай групы гаспадарак.

2. Вандроўныя раёны Калмыкіі, Кіргізіі, Казакстану, Усходняй Сібіры, Сярэдняй Азіі, Якуціі і Закаўказьзя асла баняюцца ад абавязковай пастаўкі малака ў парадку пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б). Сьпіс вандроўных раёнаў устанаўляецца СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, край (вобл.) выканкомамі і зацьвярджаецца СНК СССР.

3. У раёнах і пунктах, пя маючых пераапрацоўваючых малако прадпрыемстваў і ня вылучаных для загатовак цэльнага малака, абавязацельства па здачы малака выконваюцца таплёным маслам, пры гэтым масла прымаецца з разьліку 1 кг. таплёнага масла з утрыманьнем ня менш 95 проц. тлушчу замест 25 літраў малака. Замест таплёнага дапускаецца здача сліўачнага масла (сырцу). Сліўачнае масла (сырэц) залічваецца ў пакрыцьці абавязацельстваў з разьліку 1 кг. масла з утрыманьнем тлушчу ня менш 75 проц. замест 19 літраў малака.

4. Пражываючыя ў сельскіх мясцовасьцях і маючыя кароў настаўнікі, урачы і пом. урачоў, агрономы, зоатэхнікі і інш. спэцыялісты, калі яны не абкладаюцца сельгаспадаткам, ослабляюцца ад абавязковай пастаўкі малака дзяржаве.

5. Для гаспадарак, вышаўшых з калгасаў пасьля ўручэньня ім абавязацельстваў, нормы здачы малака пераглядаюцца і для іх на астатак году ўстанаўляюцца нормы аднаасобных гаспадарак.

Для аднаасобных гаспадарак, уступіўшых у калгасы пасьля ўручэньня ім абавязацельстваў, нормы таксама пераглядаюцца, і для іх устанаўляюцца абавязацельствы на астатак году па нормах, прадугледжаных для калгаснікаў.

6. Устаноўленыя зьменшаныя нормы здачы для калгасных двароў, уваходзячых у калгасы, маючыя малочна таварныя фэрмы, ужываюцца толькі ў адносінах калгасных двароў тых калгасаў, у якіх таварныя фэрмы былі афармлены зямельнымі і калгаснымі органамі да 1 сьнежня 1932 году.

Для членаў калгасаў, у якіх малочна-таварныя фэрмы будуць афармлены ў пэрыяд ад 1 сьнежня 1932 году да 1 ліпеня 1933 году нормы здачы павінны быць перагледжаны з 1 ліпеня 1933 году, прычым у гэтым выпадку для іх устанаўляюцца тыя-ж нормы, што і для калгасных двароў, уваходзячых у калгасы, маючыя МТФ.

7. Для кулацкіх гаспадарак, маючых кароў, абавязацельства пастаўкі малака і масла дзяржаве ўстанаўляюцца ў разьмеры двайных норм, прынятых для аднаасобных гаспадарак данага раёну.

8. СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, краёвыя і абласныя выканаўчыя камітэты апублікоўваюць у рэспубліканскім (краявым) друку параённыя гадавыя нормы здачы малака аднаасобнымі гаспадаркамі і калгаснымі дварамі, з разьбіўкай гадавой нормы па кварталах у адпаведнасьці з паквартальнымі тэрмінамі выкананьня гадавога пляну здачы малака, устаноўленымі пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 сьнежня 1932 году, а таксама апублікоўваюць параённыя нормы тлушчу ў малаце ў адпаведнасьці з сярэднім процантам тлушчу, зацьверджаным СНК СССР для края, вобласьці або рэспублікі.

Дыфэрэнцыяцыя норм здачы малака і тлушчу ў малаце ўнутры адміністрацыйнага раёну забараняецца, за выключэньнем асобных населеных пунктаў, у якіх маюцца гнёзды высокаўдойнай жывёлы, сьпіс гэтых пунктаў устанаўляецца край (вобл.) выканкомамі, прычым для гэтых пунктаў могуць быць вызначаны нормы здачы, перавышаючыя агульнараённыя.

9. Пасьля апублікаваньня ў друку параённых норм сельсаветы абавязаны ў пяцідзённы тэрмін скласьці сьпісы гаспадарак, якія маюць кароў.

а) калгасных двароў у калгасах, якія маюць таварныя фэрмы;

б) калгасных двароў у калгасах, якія ня маюць таварных фэрм;

в) аднаасобных гаспадарак,

г) кулацкіх гаспадарак.

Пасьля складаньня сьпісаў сельсаветы абавязаны ўручыць пад расьпіску кожнай маючай кароў аднаасобнай гаспадарцы і калгаснаму двару абавязацельства, у якім павінна быць указана колькасьць малака, якую трэба здаць дзяржаве, у літрах з указаньнем процанту тлушчу, месца здачы і разьбіўкі гадовай нормы здачы па месяцох у адпаведнасьці з устаноўленымі для раёну край (вобл.) выканкомамі каляндарнымі тэрмінамі гадовага пляну здачы малака.

Сьпісы складаюцца сельсаветамі ў двух экзэмплярах, з якіх адзін экзэмпляр з сапраўднымі расьпіскамі асоб, якім уручаны абавязацельствы, захоўваецца ў сельскім савеце, а другі экзэмпляр—накіроўваецца на прыёмачны пункт загатоўцы, да якога прымацаваны даны здатчык.

II. Здача малака калгаснымі малочна таварнымі фэрмамі мясными фэрмамі, фэрмамі па вырошчваньні маладняка і калгасамі з аграмаджаным стадам

10. Гадавы, квартальны і месячны пляны здачы малака дзяржаве МТФ і калгасамі з аграмаджаным стадам зацьвярджаюцца па раёнах саўнаркомамі саюзных і аўтаномных рэспублік і край (вобл.) выканкомамі. Разьбіўка зацьверджаных для раёну пляну здачы па асобных калгасах утвараецца раённай камісіяй пад старшынствам старшыні або намесьніка старшыні райвыканкому па загатоўках у складзе: райснабу, райканторы загатарганізацыі, райза і раённага аб'яднаньня калгасных таварных фэрм з удзелам зацікаўленага калгасу ў гладнай адпаведнасьці з устаноўленымі для МТФ данага раёну нормамі здачы малака з разьліку ўсіх наяўных кароў на 1 сьнежня 1932 году і зацьвярджаюцца па кожнай фэрме і калгасу ў паасобку райвыканкомам. Адначасова з зацьверджаньнем пляну, райвыканком устанаўляе процант тлушчу ў здаваемым малацэ ў адпаведнасьці з устаноўленымі СНК рэспублікі край (вобл.) выканкомамі нормамі.

11. Сельска-гаспадарчыя камуны і арцелі, у якіх жывёла аграмаджана поўнасьцю, мясныя фэрмы і фэрмы па вырошчваньні маладняка выконваюць дзяржаўныя абавязацельствы па пастаўцы малака з наступнай скідкай супроць норм, прынятых для МТФ калгасаў: сельска-гаспадарчыя камуны на 25 проц., арцелі—на 20 проц., мясныя фэрмы і фэрмы па вырашчваньні маладняка, зарэгістраваныя да 1 сьнежня 1932 году,—на 25 проц.

12. Для чырвонаармейскіх калгасаў, арганізаваных у 1931-32 годзе, утвараецца скідка ў разьмеры 25 проц. з нормы пастаўкі малака, устаноўленай для калгасаў і калгаснікаў данага раёну.

13. Прыгарадныя гаспадаркі сыстэмы Цэнтрасаюзу, сельСТ і савецкія гаспадаркі, арганізаваныя дзяржаўнымі установамі і прадпрыемствамі для забясьпечаньня сваіх рабочых і служачых, здачу малака ў парадку падатку ў 1933 годзе не ўтвараюць.

III Месца здачы і дастаўкі малака

14. Калгасьнікі і аднаасобнікі абавязаны дастаўляць малако непасрэдна на масласыразаводы, зьліўныя і сэпаратарныя пункты загатоўцаў у радыусе 2 кілёмэтраў. Пры адсутнасьці ў паказаным радыусе прыёмачных пунктаў загатоўцаў або кальцовай зборкі калгасьнікі і аднаасобнікі маюць права здаваць замест малака масла з дастаўкай на бліжэйшы пункт загатоўцы. Масла здаецца не радзей аднаго раза ў месяц.

15. МТФ калгасаў і калгасы з аграмаджаным стадам абавязаны дастаўляць здаваемае малако непасрэдна на масласыразаводы, іх зьліўныя, прыёмачныя і сэпаратарныя пункты, а так сама дастаўляць сьліўкі з сэпаратарных пунктаў загатоўцаў на масласыразаводы ў радыусе да 10 кілёмэтраў.

У раёнах загатовак цэльнага малака радыус дастаўкі устанавіць 15 кілёмэтраў.

Устанавіць узнагароды за дастаўку малака з разьліку 1 рубель за кожную тону-кілёмэтр, дастаўленую на адлегласьці звыш 2 кілёмэтраў, а за дастаўку сьлівак—за ўсю адлегласьць ад сэпаратарных пунктаў да масласыразаводу.

IV. Умовы здачы і прыёмкі малака і масла

а) ЯКАСЬЦЬ МАЛАКА.

16. Здаваемае малако павінна быць сьвежым, неабястлушчаным (нязьдымане, неразбаўленае вадой), бяз усякіх дамешак, не забруджаным і дастаўляцца на прыёмачны пункт у чыстай прыкрытай пасудзе ў дзень удою.

Здаваемае замест малака масла павінна быць бяз усякіх дамешак і не забруджаным.

Забруджанае і дрэннай якасьці масла загатоўца мае права ня прымаць у лік абавязацельстваў па здачы масла дзяржаве.

17. Малако, атрымліваемае ад кароў на пранёну 7 дзён пасьля нараджэньня, прыёму не падлягае.

18. Здаваемае малако павінна ўтрымліваць процант тлушчу ў адпаведнасьці з параённымі гадавымі нормамі, устаноўленымі край (вобл.) выканкомамі згодна п. 8 разьдзелу I данай інструкцыі.

У выпадку здачы малака або масла з паніжанай супроць нормы тлустасьцю здатчык абавязаны недаданую колькасьць тлушчу папоўніць здачай дадатковай колькасьці малака.

19. Прадаставіць права загатоўцам ня прымаць у лік абавязацельстваў па здачы малака з кіслотнасьцю вышэй 20° па Тэрнеру пры здачы яго на масласыразаводы і на зьліўныя пункты, а ў раёнах загатовак цэльнага малака і ў зонах загатовак кансэрвовымі заводамі з кіслотнасьцю вышэй 18° па Тэрнеру.

20. Дырэктары масладзельных, сыраваранных, кансэрвовых і малочных заводаў, а таксама старшыні сельСТ, прымаючыя малако і масла, абавязаны прыцягваць да крымінальнай адказнасьці па арт. 169 Крымінальнага кодэксу РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых саюзных рэспублік асоб, вінаватых у спробе здаваць здымане і фальсыфікаванае (з дамешкамі) малако і масла.

Органы судовага і пракурорскага нагляду абавязаны разглядаць усе справы па фальсыфікацыі малака і масла ў пяцідзённы тэрмін з моманту іх атрыманьня.

б) КОЛЬКАСЬЦЬ ЗВАРОЧВАЕМАГА АБРАТУ.

21. Масласыразаводы і абслугоўваючыя іх сэпаратарныя пункты абавязаны зварочваць абрат МТФ і калгасам з аграмаджаным стадам у разьмеры 50 проц., мясным фэрмам і фэрмам па вырошчваньні маладняка, зарэгістраваных да 1 сьнежня 1932 году, у разьмеры 85 проц., а калгаснікамі, аднаасобным сялянскім гаспадаркам у разьмеры 35 проц., ад вагі здаванага імі малака са спагнаньнем за зьварочваемы ім абрат па 2 кап. за літар.

Сыразаводы, цэльнамалочныя і кансэрвовыя прадпрыемствы абрату не варочаюць.

V. Цана і парадак разьліку за здаваемае малако і масла

22. Устаноўленую пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 сьнежня 1932 году для калгасных фэрм, калгасаў, калгасных двароў і аднаасобнікаў загатоўленую цану за малако ў разьмеры 15 кап. за літар увесьці ва ўсіх без выключэньня раёнах, у тым ліку ў раёнах загатовак цэльнага малака пры базісной тлустасьці здаваемага малака, устаноўленай для данага раёну згодна п. 8, разьд. 1 данай інструкцыі і базісной кіслотнасьці ў 20° па Тэрнеру

Для раёнаў загатовак цэльнага малака, а таксама для зон загатовак малака кансэрвовымі заводамі, устанаўляецца спэцыяльная надбаўка ў разьмеры 5 кап. за літар за ўстаноўленую для гэтых раёнаў паніжаную базісную кіслотнасьць (18° па Тэрнеру супроць 20° у масладзельных раёнах).

23. Устанавіць даплату або скідку ад цаны за літар малака ў разьмеры 4 кап. за кожны дадатковы або нехапаючы процант тлушчу і скідку ў 1 кап. за кожны градус, перавышаючы градусную кіслотнасьць.

24. Таплёнае масла пры тлустасьці 95 проц., аплачваецца ў разьмеры 3 руб. 40 кап., а сьлівачнае масла (сырэц) пры тлустасьці 75 проц.—2 руб. 50 кап. за кілёграм.

25. Разьлік са здатчыкамі малака і масла утвараецца непасрэдна прыёмачнымі пунктамі загатоўцаў:

а) за здаваемае малако два разы ў месяц,

б) за здаваемае масла—пры здачы.

VI. Улік і адказнасьць за невыкананьне здатчыкамі сваіх абавязацельстваў

26. Загатарганізацыі абавязаны выдаць праз сельсаветы ўсім здатчыкам малака або масла аднаасова з уручэньнем ім абавязацельстваў па здачы малака або масла спэцыяльныя кніжкі, у якіх заготпункты (масласыразаводы), зьліўныя пункты і прыёмачныя пункты таплёнага масла абавязаны распісвацца ў прыёмцы ад здатчыкаў малака і масла, здаваемага ў улік абавязацельства. Здатчыкі абавязаны не пазьней 5 дзён пасьля сканчэньня месяца прадаўляць гэтыя кніжкі ў сельсаветы для праверкі і ўліку сельсаветам выкананьня імі сваіх абавязацельстваў.

Зьліўныя сэпаратарныя і прыёмачныя пункты загатоўцаў абавязаны весьці самастойны ўлік выкананьня здатчыкамі сваіх абавязацельстваў і штомесяц не пазьней 5 дзён пасьля сканчэньня справаздачнага месяца прадстаўляць сельсавету сьпісы здатчыкаў, ня выканаўшых месячных абавязацельстваў па здачы малака або масла, для накладаньня штрафаў і прыцягненьня да судовай адказнасьці.

27. Сельсаветы абавязаны ў 10-дзённы тэрмін пасьля сканчэньня месяца штрафаваць грашыма ўсіх ухіляючыхся ад здачы малака або масла дзяржаве ў разьмеры рыначнага кошту ня выкананай часткі абавязацельстваў, прычым недавыкананая частка абавязацельства падлягае спагнаньню ў бясспрэчным парадку ў наступным месяцы звыш нормы здачы гэтага месяца

У выпадку паўторнага невыкананьня абавязацельстваў вінаватыя падлягаюць шт